Доступ да навуковых рэсурсаў па каронавіруснай інфекцыі *COVID-19* арганізаваны на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Вядучыя выдавецтвы і агрэгатары інфармацыі, сярод якіх *Elsevier, Springer Nature, Wiley, Cambridge University Press, Oxford University Press* ды іншыя, забяспечылі адкрыты доступ да інфармацыі з-за абвастрэння эпідэміялагічнага становішча ў свеце. Раней матэрыялы электронных рэсурсаў былі даступныя выключна па падпісцы. Прадстаўнічыя калекцыі фактычных дадзеных пра распаўсюджванне віруса і навуковыя публікацыі па выніках апошніх даследаванняў каронавірусных інфекцый дазволяць узмацніць інфармацыйную падтрымку мер па прафілактыцы, дыягностыцы і лячэнні хваробы, а таксама павысяць эфектыўнасць даследаванняў па *COVID-19*, у тым ліку з удзелам беларускіх вучоных. Некаторыя выдавецтвы прапаноўваюць таксама бясплатны доступ у рэжыме анлайн да падручнікаў для вышэйшай адукацыі, даведачных матэрыялаў, перыядычных выданняў па эканоміцы, юрыспрудэнцыі, бухгалтарскім уліку, менеджменце, маркетынгу, фінансах, прыродазнаўчых навуках і гэтак далей.